# НАВУМОВІЧ
# Уладзімір
# Аляксандравіч




## Біяграфія

Нарадзіўся ў сям'і патомных сельскіх настаўнікаў, агульны педагагічны стаж якіх складае больш 200 гадоў. У 1960 г. скончыў Ярэміцкую сярэднюю школу. Працаваў настаўнікам беларускай мовы і літаратуры Беражноўскай васьмігадовай школы Карэліцкага раёна.

У 1966 г. скончыў філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Быў на камсамольскай рабоце — у Ленінскім райкаме камсамола Мінска, у Мінскім абкаме камсамола, лектарам ЦК ЛКСМБ. У 1973 г. скончыў аспірантуру пры кафедры беларускай літаратуры БДУ, у наступным годзе абараніўшы кандыдацкую дысертацыю па філалогіі (тэма «Проза „Маладняка"»). З 1973 г. выкладчык, з 1978 г. — дацэнт кафедры беларускай літаратуры філалагічнага факультэта БДУ. У 1982—1983 гг. загадчык кафедры рускай мовы для замежных студэнтаў, у 1989 г. — загадчык кафедры беларускай мовы і літаратуры для прыродазнаўчых факультэтаў, у 1989—2000 гг. — загадчык кафедры беларусазнаўства філалагічнага факультэта БДУ.

У 1990—1994 гг. адначасова ўзначальваў Міжнародную школу беларускай мовы, літаратуры і культуры пры БДУ, слухачамі якой сталі вучоныя-славісты Аўстрыі, Вялікабрытаніі, Германіі, Егіпта, ЗША, Канады, Расіі, Украіны, Швейцарыі, Японіі, што стварылі ў сваіх краінах беларусазнаўчыя цэнтры. Школа працуе і дагэтуль. У 2003—2008 гг. з'яўляўся саветнікам рэктара БДУ. Цяпер дацэнт кафедры беларускай мовы і літаратуры філалагічнага факультэта БДУ. Член Саюза пісьменнікаў СССР з 1990 г. У шлюбе з жонкай Людмілай больш 50 – ці гадоў, выгадавалі 2 дачок.

# Творчасць

Першыя апавяданні надрукаваў у 1964 г. (наваградская раённая газета «Новае жыццё» і «Чырвоная змена»). Аўтар аповесцей «Узаранае поле» (часопіс «Маладосць», 1968), «Такое бывае аднойчы» (1982), аўтар 9 манаграфій, сярод іх: «Шляхамі арлянят», Проза «Маладняка» (1984), дапаможнікаў «Беларусазнаўства: Навучальны дапаможнік для студэнтаў Вышэйшая навучальная ўстанова» (у сааўтарстве, пад рэд. П. І. Брыгадзіна) (1989), «Беларуская літаратура: вучэбны дапаможнік для сярэдніх спецыяльных навучальных установў» (пад грыфам) (2000), дапоўненая і перапрацаваная ў адпаведнасці са зменамі ў вучэбных праграмах, выходзіла ў свет у выдавецтве “Вышэйшая школа”. «Беларуская літаратура XX стагоддзя: Гісторыя і сучаснасць» (2005). Напісана звыш 350 навуковых артыкулаў. У 2019 г. у выдавецтве «Мастацкая літаратура» выйшаў эпісталярны раман Уладзіміра Навумовіча «Вабюліманс», прысвечаны каханню Максіма Багдановіча. Аўтар 15 кніг прозы, аповесцей і апавяданняў, раманаў, літаратурнакрытычных артыкулаў, манаграфій, зборнікаў тэзісаў, матэрыялаў навуковых канферэнцый.




# Узнагароды

Медаль Францыска Скарыны.

Узнагароджаны нагрудным знакам Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь «Выдатнік адукацыі».

Прэмія «Залаты купідон» 2013 года — за вучэбны дапаможнік новага пакалення «Беларуская літаратура» з электронным дадаткам.

Кніга “Университет – феномен цивилизации” (2011) узнагароджана дыпломам “Лепшая кніга года” ў намінацыі “Краязнаўства”.

У 2013 г. яму прысвоена званне “Заслужаны работнік Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта”.